*Л.К.КУХТО*

# АЎТАСТЭРЭАТЫПЫ БЕЛАРУСАЎ ЯК ЧАСТКА ІХ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ САМАСВЯДОМАСЦІ

Дзяржаўнае будаўніцтва Рэспублікі Беларусь выклікала складаныя працэсы ў развіцці эканомікі і базісных элементаў грамадства, што пэўным чынам паўплывала на развіццё нацыянальнай культуры, прымусіла па-новаму зірнуць на яе стан і перспектывы. Не выпадкова ў сферы культуралогіі прыметна адчуваецца патрэба ў даследаванні своеасаблівасцей нацыянальнай ідэнтычнасці, нацыянальнага характару беларускага народа, шляхоў і перспектыў нацыянальна-культурнага адраджэння. У культуралагічнай, мастацтвазнаўчай і філасофскай літаратуры ўвагу даследчыкаў сталі часцей прыцягваць сімвалічная структура нацыянальнай самасвядомасці і яе ўплыў на культуру. Складаючай часткай самасвядомасці з'яўляюцца этнакультурныя стэрэатыпы, пад якімі разумеюцца абагульненыя ўяўленні аб тыповых рысах, што характарызуюць які-небудзь народ. У культуралогіі прынята вылучаць два віды этнакультурных стэрэатыпаў: аўтастэрэатыпы і гетэрастэрэатыпы. Яны складваюцца і ўкараняюцца ў грамадстве ў якасці агульнавядомых традыцыйных поглядаў. Як паказваюць спецыяльныя даследаванні, аўтастэрэатыпы адлюстроўваюць тое, што думаюць этнафоры аб сваім уласным народзе, а гетэрастэрэатыпы адлюстроўваюць меркаванні, якія адносяцца да іншага народа.

З дапамогай аўтастэрэатыпаў фарміруюцца агульныя нарматывы паводзін чалавека як прадстаўніка свайго народа. Этнапсіхалагічны аналіз сведчыць: у аўтастэрэатыпах народ заўсёды ў пэўнай меры ідэалізуе і ўзвышае сябе, прыўносіць у яго пазітыўныя рысы, якія неабходны для яго выжывання ў дадзеных сацыяльна-геаграфічных умовах. У той жа час у аўтастэрэатыпы уключаюцца псіхічныя асаблівасці, спасылкай на якія людзі імкнуцца да самаапраўдання свайго ладу жыцця. Даследаванні паказваюць, што нацыі, якія знаходзяцца на больш высокім узроўні эканамічнага развіцця, маюць тэндэнцыю падкрэсліваць у сабе такія вартасці, як розум, прадпрымальнасць, дзелавітасць. Расійскі даследчык К.С.Гаджыеў прыводзіць многа прыкладаў прагматычнай накіраванасці мыслення амерыканцаў [2, с. 75]. Сучасны амерыканец, як правіла, упэўнены, што жыве ў самай перадавой дзяржаве свету. Перавага амерыканскай сацыяльна-палітычнай сістэмы, амерыканскага ладу жыцця, амерыканскай культуры – для яго аксіёма. Таму ён бачыць свой абавязак у іх распаўсюджванні па свеце.

З другога боку, заўважана, што нацыі з больш адсталай эканомікай схільны акцэнтаваць такія свае рысы, як дабрыня, сардэчнасць, гуманнасць, гасціннасць, зніжаючы пры гэтым значнасць якасцей, якія забяспечваюць рост эканамічнага дабрабыту. І.Кант у ХІХ ст. адзначаў, што немцы карыстаюцца рэпутацыяй людзей сумленных, дамавітых, развažлівых, сціплых. Яны больш за іншыя народы падначальваюцца ўраду, не імкнуцца да змен і барацьбы з існуючым парадкам [4, с. 565–572].

У шэрагу навуковых і літаратурных прац зроблены спробы вызначыць і апісаць этнакультурныя асаблівасці беларусаў. Ужо ў рэнесанснай паэме Міколы Гусоўскага "Песня пра зубра" перадаюцца пачуцці, думы, сацыяльная псіхалогія беларусаў. У паэме Гусоўскага даецца панарамная карціна жыцця народа і лёсу краіны ў пераломны момант гісторыі. Сілач між звяроў, мудры і чуйны зубр "кемлівы звер на прыродзе", ён люты і бязлітасны, калі абараняецца пры нападзе ворагаў. Носьбітам даўніх гераічных ідэалаў Гусоўскі малюе працавітых людзей. Яны адважныя і смелыя, вынослівыя і ўмелыя. У паэме беларускі народ надзяляецца такімі рысамі, як гаспадарлівасць, салідарнасць, гатоўнасць у крытычны момант прыняць на сябе небяспеку, выручыць таварыша [3, с. 30].

У айчыннай навуцы сістэматычныя даследаванні свайго народа пачынаюцца з сярэдзіны ХІХ ст. Першапачаткова каардынуючым цэнтрам гэтых даследаванняў з'яўляўся Віленскі універсітэт, выхаванцамі якога былі Я.Чачот, Т.Зан, Я.Баршчэўскі і інш. Значную ролю ў вывучэнні быту, фальклору беларусаў адыгралі этнографы П.Шпілеўскі, К.Тышкевіч, А.Кіркор, І.Грыгаровіч, І.Насовіч і інш. Этналагічныя даследаванні мелі ў асноўным практычны характар. У аснове такога падыходу знаходзяцца сацыякультурныя і гісторыка-палітычныя прычыны: 2-я палова ХІХ ст. – перыяд прадвесця "беларускага Адраджэння", калі наш народ упершыню за стагоддзі прававога і нацыянальна-культурнага прыгнёту заявіў аб уласных багатых культурных традыцыях. Таму першапачатковай функцыяй даследчыкаў быў паказ самабытнасці беларускага этнасу, а не стварэнне тэарэтычных парадыгмаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Даследаванні беларусаў у XX ст. развіваліся ў кантэксце гісторыка-этнаграфічнага падыходу Прыкладам можа быць праца Я.Карскага “Белорусы”. У ёй аўтар выкарыстоўвае не толькі этнаграфічныя і гістарычныя, але і антрапалагічныя, лінгвістычныя, археалагічныя звесткі.

Першая сусветная вайна прыпыніла вывучэнне беларускага народа, і этнаграфічныя даследаванні Беларусі аднавіліся толькі пасля ўмацавання савецкай улады (А.Шлюбскі “Матэрыялы да вывучэння фальклору і мовы Віцебшчыны”, 1930 г., і інш.). Аднак навукоўцы не абмяжоўваліся толькі этнаграфічнымі даследаваннямі. Важным пачаткам у галіне нацыянальна-культурнай асветы былі “Кароткая гісторыя Беларусі” В.Ластоўскага; “Курс беларусазнаўства” (аўтары У.Пічэта, М.Янчук, Д.Жылуновіч і інш.). У апошняй працы змяшчаліся лекцыі, прачытаныя ў Беларускім народным універсітэце ў Маскве ў 1918 г. У гэтым радзе і курс лекцый “Кароткі нарыс нацыянальна-культурнага адраджэння Беларусі”, які ў 1917–1918 гг. быў прачытаны ў Мінскім педагагічным інстытуце У.Ігнатоўскім. З’яўляюцца працы культуралагічнага характару: “Што трэба ведаць кожнаму беларусу” В.Ластоўскага, “Западно-руссизм” А.Цвікевіча, “Беларускае Адраджэнне” М.Багдановіча, “Адвечным шляхам” І.Абдзіраловіча [8].

Беларускі народ становіцца аб’ектам мастацкай паэтызацыі. Так, у вершы Янкі Купалы “А хто там ідзе?” створаны абагульнены вобраз беларускага народа дарэвалюцыйнага часу – агромністай грамады. Ідуць беларусы, “пагарджаныя век” людзі: у іх худыя плечы, рукі ў крыві, ногі ў лапцях, яны “сляпыя”, “глухія”. Але яны не забітыя і пакорлівыя, яны хочуць “людзьмі звацца”. Таму і нясуць сваю крыўды на паказ усяму свету [7].

З небывалым эпічным размахам і філасофскай глыбінёй на звычайным бытавым матэрыяле паказаў беларусаў Якуб Колас у паэме “Новая зямля” [6]. Узвышэнне чалавека-працаўніка, услаўленне яго імкненняў да волі, паэтызацыя працы складаюць пафас паэмы. Беларус з яго штодзённым бытам, з яго думамі, надзеямі, імкненнямі ўпершыню прадстаў перад чытачамі ва ўвесь рост. У вобразах Міхала і Антося Колас увасобіў прыроджаны розум і працавітасць, высакародства і маральную чысціню, вольналюбства і непакорлівасць, настойлівасць у дасягненні пастаўленай мэты беларусаў.

Прывабныя ў паэме і жаночыя вобразы. Ганна не толькі руплівая, клапатлівая гаспадыня, але і добрая, чулая маці, спагадлівая жонка. Яна старанна ахоўвае дабрабыт сям’і, яе маральную чысціню. У паэме нямала радкоў, якія сведчаць аб прадбачлівасці, прыроджаным розуме і цвярозай разважлівасці Ганны.

З канца 60-х гг. XX ст. пачынаюць друкавацца навуковыя працы па этнаграфічнай і гістарычнай праблематыцы. Гэта “Гісторыя беларускай этнаграфіі XIX ст.”, “Гісторыя беларускай этнаграфіі. Пачатак XX ст.” В.Бандарчыка, калектыўныя зборнікі “Беларускі эпас”, “Беларускі этнаграфічны зборнік”, “Беларускі народны тэатр батлейка” Г.Барышава і А.Саннікава і інш. Пасля стварэння ў 1957 г. Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР з’явіліся фундаментальныя калектыўныя манаграфіі “Белорусы” (серыя “Народы мира”)”, “Этнические процессы и образ жизни”, энцыклапедыя “Этнаграфія Беларусі”. Аднак адлюстраванне рыс нацыянальнага характару, феномена этнакультурнай самасвядомасці і самаідэнтыфікацыі па палітычных прычынах не маглі знайсці месца ў друку, хаця ўсё гэта закраналася вучонымі пры аналізе быту, фальклору, вераванняў этнасу.

Другі кірунак даследаванняў беларусаў цесна злучаны з аналізам паняццяў “менталітэт”, “нацыянальная самасвядомасць”, “этнакультурная ідэнтыфіка-цыя”. Менталітэт этнасу, яго душу, маральна-каштоўнасныя арыентацыі і ідэалогію ў многім фарміруюць ландшафт і гісторыя. Даследчыкі адзначаюць, што па прычыне балотнага, ляснога ландшафту беларусы спрадвеку вымушаны былі сяліцца невялікімі абшчынамі. Гэта спарадзіла шэраг спецыфічных рыс беларускага менталітэту, такіх як вынослівасць, уменне мужна пераносіць нягоды, а таксама пэўны індывідуалізм. Так, калі рускі селянін у многім залежаў ад абшчыны і будаваў жыццё, узгадняючы свае рашэнні з грамадскім меркаваннем, беларус заўсёды ведаў, што свае задачы ён павінен вырашаць сам. Менавіта гэта садзейнічала фарміраванню знакамітага беларускага працалюбства, упартасці ў дасягненні мэты і, нарэшце, некаторай адасобленасці ад вялікіх калектываў.

Беларус – жыхар раўніны, яго сувязь з зямлёй заўсёды мела сімбіятычны характар. Зямля для беларуса – не проста месца пражывання. Зямля – падмурак быцця беларуса, яго галоўная апора. На наш погляд, менавіта гэта любоў да свайго “роднага кута” спарадзіла і такую неадназначную рысу нацыянальнага характару, як “тутэйшасць”. У гэтым паняцці хаваюцца неакрэсленасць,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

амбівалентнасць нашай нацыянальнай самасвядомасці. Узнікненню “тутэйшасці” садзейнічала працяглая барацьба Расіі і Рэчы Паспалітай. У перыяд шматлікіх войнаў беларусаў спрабавалі акаталічыць і русіфікаваць. Падаецца, усведамеленне сябе не рускімі, не палякамі, а “тутэйшымі” было пэўным спосабам абароны самабытнасці народа і культуры.

Асноўным паняццем пры аналізе сацыяльна-псіхалагічных асноў менталітэту з’яўляецца паняцце каштоўнасцей. У сістэме беларускіх этнічных каштоўнасцей значнае месца належыць такім ментальным рысам, як талерантнасць, цярпімасць, памяркоўнасць беларускага народа. Аб іх сведчыць мноства гістарычных фактаў. Так, за ўвесь час існавання Беларусі на яе тэрыторыі не было канфліктаў на нацыянальна-рэлігійнай глебе. Стагоддзямі беларусы пражывалі ў поліэтнічных дзяржавах побач з рускімі, яўрэямі, татарамі, украінцамі, літоўцамі і інш. Узаемаадносіны паміж імі былі, як правіла, добразычлівымі і бесканфліктнымі.

Такім чынам, вызначаны даследчыкамі вобраз тыповага беларуса можна ахарактарызаваць так: цярплівы, гасцінны, спакойны, працалюбівы, разумны, добры, нерашучы, марудны, пасіўны, даверлівы, сумленны, разважлівы. А.П.Шэйн яшчэ адзначаў, што ў быце для беларусаў характэрна аднолькавае становішча мужчыны і жанчыны. Заўважым, што беларускі самавобраз і погляд на беларуса прадстаўнікоў літаратурных колаў амаль ідэнтычныя з поглядамі даследчыкаў структуры ментальнасці. Дастаткова звярнуцца да літаратурнай спадчыны У.Караткевіча, каб пераканацца ў сугучнасці меркаванняў наконт асаблівасцей ментальнасці беларусаў. Яго нарыс “Зямля пад белымі крыламі” з’яўляецца этнакультурнай працай [5]. Гэта, бадай што, першая ў беларускай літаратуры мастацкая гісторыя культуры Беларусі, своеасаблівая даніна любові аўтара да роднай зямлі, асвечаная арыгінальнай думкай і адметным поглядам У.Караткевіча на працэсы гістрычнага развіцця беларусаў і іх суседзяў.

Дамінантай эпістэмалагічных уяўленняў У.Караткевіча з’яўляецца комплекс каштоўнасных арыентацый і рэгулятараў. У якасці базавых аўтар вылучае нацыянальную самасвядомасць як фактар культуратворчасці, узвышэнне мовы, выхаванне моладзі праз веды, фальклор і мастацтва, вызначэнне ролі асобы ў гісторыі і культуры, фарміраванне павагі да сацыякультурнай памяці, дэманстрацыйнае сцвярджэнне беларускіх каштоўнасцей, заклік да актыўнага і дзейснага патрыятызму, асэнсаванне нацыянальнай культуры ў славянскім і еўрапейскім культурным кантэксце, вывучэнне народа як суб’екта культуры, даследаванне беларускага нацыянальнага характару.

Мастак ставіў перад сабой задачу развеяць уяўленне пра беларусаў як пра бедную на таленты нацыю, няздатную самастойна ўладкоўваць свой лёс (“забітасць і апатыя – прадукт гістарычных, палітычных і эканамічных умоў, у якіх складвалася жыццё беларусаў”), растлумачыць прычыны ўзнікнення такой несправядлівай думкі, ён палемізуе з «рыдальцамі над меншым братам», абвяргае комплекс непаўнавартасці, які прыпісвалі беларусам. У.Караткевіч хацеў, каб грамадства разабралася ў тым, што сапраўдная беларуская культура зусім не тая, якую прапагандавалі шавіністычна настроеныя ідэолагі і гісторыкі. Яны сцвярджалі, што беларусам уласціва толькі сялянская культура і адмаўлялі набыткі, створаныя арыстакратыяй. Гэта канцэпцыя ўвязвалася з сялянскім паходжаннем мовы, адсутнасцю (паводле іх поглядаў) у беларусаў гісторыі, дзяржаўнасці: «Назва “Беларусь” ёсць геаграфічны тэрмін і не мае асобнага гістарычнага значэння, як ні асобнай народнасці, ці нават асобнага племені беларускага не існуе». Мастак паказваў, што беларусы маюць багатыя набыткі, якія выходзяць далёка за межы сялянскай культуры, услаўляе моц і гонар народа, даказвае яго права на самастойны шлях. Пісьменнік раскрывае для чытачоў вялікія дасягненні беларусаў у навуцы, літаратуры, мастацтве, юрыспрудэнцыі, дае нам магчымасць адчуць гонар за сваю Радзіму, асэнсаваць дзеянні продкаў, адкрыць для сябе свой народ [1].

У.Караткевіч адлюстроўвае ідэальны самавобраз беларуса. Гэты самавобраз мае пазітыўны характар і адпавядае свайму сацыяльна-гістарычнаму і псіхакультурнаму прызначэнню – кансалідацыі членаў этнасу ў адзінае цэлае, усведамленню ўласных калектыўных сіл і магчымасцей. У “Зямлі пад белымі крыламі” мастак увасабляе маральную чысціню свайго народа, мудры погляд на чалавечыя ўчынкі, грамадзянскую адказнасць перад жыццём, новымі пакаленнямі. У нарысе прапагандуюцца чулыя адносіны паміж бацькамі і дзецьмі, працоўны лад жыцця як крыніца матэрыяльнага і маральнага дабрабыту, любоў да Радзімы як найвышэйшая каштоўнасць, павага да старэйшых, нянавісць да ворагаў, гасціннасць, мужнасць, дабрыня. Мэта У.Караткевіча – даказаць усяму свету і перш за ўсё самім беларусам, што іх Радзіма – гэта край

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

высокай маралі, край, што захаваў памяць продкаў, край, дзе шануюць традыцыі і перадаюць іх з пакалення ў пакаленне.

Пісьменнік ствараў уяўленне аб народзе як аб адзінстве пакаленняў, аб этнічнай свядомасці як аб народным сумленні, дзе ўвасабляюцца маральна-этычныя і эстэтычныя каштоўнасці. Народ у мастака – суб'ект нацыянальнай ідэі і патрыятызму.

Такім чынам, даследаванне фактараў фарміравання, глыбіннай спецыфікі і сучаснага стану калектыўнай свядомасці беларусаў сведчыць, што спецыфічнымі рысамі ментальнасці беларусаў з'яўляюцца прыярытэт экацэнтрычных установак, адсутнасць каштоўнасцей нацыянальнай і сацыяльнай выключнасці, непрыманне радыкальнасці ў падыходах да праблем змянення свету, грамадства, чалавека. У той жа час, дзякуючы рэсурсам беларускай ментальнасці, захоўваюцца ўмовы для прызнання беларускім соцыумам самабытнасці іншых сацыяльных супольнасцей і ўзгаднення ўласных інтарэсаў з нацыянальнымі інтарэсамі іншых народаў.

1. *Банцэвіч П.К.* Культуралагічныя інтэнцыі ў творчасці Уладзіміра Караткевіча: Аўтарэф. дыс... канд. культуралогіі: 24.00.01 – тэорыя і гісторыя культуры / Бел. дзярж. ун-т культуры. – Мн., 2004. – 22 с.

2. *Гаджиев К.С.* Американская нация: национальное самосознание и культура. – М.: Наука, 1990. – 239 с.

3. *Гусоўскі М*. Песня пра зубра: [Паэма]. – Мн.: БГАКЦ, 1994. – 48 с.: іл., партр.

4. *Кант И*. Сачинения: В 6 т. – М.: Мысль, 1966. – Т. 6. – 743 с.

5. *Караткевіч У*. Зямля пад белымі крыламі: Нарыс. – Мн.: Маст. літ., 1977. – 175 с., іл.

6. *Колас Я.* Новая зямля. Сымон-музыка: Паэмы. – Мн.: Юнацтва, 1998. – 447 с.

7. *Купала Я.* А хто там ідзе? // Купала Я. Жыве Беларусь: Вершы, артыкулы. – Мн.: Маст. літ., 1993. – 477 с.

8. *Лыч Л., Навіцкі У.* Гісторыя культуры Беларусі. – Мн.: Экаперспектыва, 1996. – 453 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ